**Практическую значимость**. Собранный материал может быть использован на факультативных занятиях и внеклассных мероприятиях в рамках предметных недель.

В заключении следует отметить, что невербальное общение постоянно изучается, и собранный нами языковый материал показывает, что дальнейшее изучение этого аспекта может быть продолжено и может дать интересные результаты.

УДК 821.161.3-4

Навуч. М.А. Агароднікаў, І.І. Дзюрава
Навуковы кіраўнік А.К. Пекач, настаўнік беларускай мовы і літаратуры, настаўнік-метадыст (ДУА "Ліцэй № 2 г. Мінска")

## ДУХОЎНА-ЭСТЭТЫЧНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ Ў ЭСЭ У. КАРАТКЕВІЧА І Л. РУБЛЕЎСКАЙ

Духоўна-эстэтычныя каштоўнасці складаюць аснову культуры народа, з'яўляюцца правіламі, эталонамі, канонамі, нормамі, ідэаламі для ўсіх і кожнага, фарміруюць унутраны свет чалавека, удасканальваюць яго духоўна, дапамагаюць імкнуцца да самаразвіцця і самаўдасканалення, прытрымлівацца традыцый, вызначаць свой стыль, культурную самабытнасць. Духоўна-эстэтычныя каштоўнасці беларусаў, на наш погляд, выяўляюцца ў эсэ У. Караткевіча і Л. Рублеўскай, бо ў іх асэнсоўваецца сусветная і айчынная гісторыя, менталітэт нацыі, культурныя традыцыі, філасофскія пытанні.

*Духоўныя каштоўнасці* – універсальныя каштоўнасці, якія складаюць аснову культуры народа, неабходныя для фарміравання і развіцця ўнутранага свету чалавека, яго духоўнага ўдасканалення. *Эстэтычныя каштоўнасці* – гэта ідэальныя ўяўленні пра дасканаласць і мэтазгоднасць, пра добрае і сапраўднае, прыгожае і гарманічнае, узвышанае і цудоўнае, пра прыгажосць, якія адлюстроўваюць свет рэалій і ідэй, каштоўнасці, што дапамагаюць прытрымлівацца традыцый, вызначаць свой стыль, культурную самабытнасць.

*Эсэ* – жанр прозы, у якім у маналагічнай форме выражаецца светапогляд пісьменніка. Жанру ўласцівы суб'ектыўнасць, філасафічнасць, адсутнасць павучальнасці, парадаксальнасць, эмацыянальнасць, рэфлексійнасць [2; 5]. *Эсэ-нарыс* – разнавіднасць малой формы прозы (у прыватнасці эсэ), якая адрозніваецца большай апісальнасцю, закранае сацыяльныя праблемы, аналізуе факты і з'явы, растлумачаныя самім аўтарам; сумяшчае адзнакі мастацкай

літаратуры і публіцыстыкі [2]. *Інфарматыўнае эсэ* валодае інфарматыўнасцю, аб’ектыўнымі рэальнымі фактамі, суб’ектывізмам, філасофскім асэнсаваннем рэчаіснасці, выбітнай філасафемай [1].

У творчасці *У. Караткевіча* маюць месца розныя віды эсэ: эсэ-нарыс, эсэ-партрэт, эсэ-замалёўка, эсэ-рэцэнзія, эсэ-артыкул, эсэ-фельетон, эсэ-ліст [2]. Найбольш пашыраным з’яўляецца эсэ-нарыс. Эсэ пісьменніка лёгка ўспрымаюцца, маюць глыбокую філасафічнасць, насычаныя думкамі, ідэямі, адрозніваюцца духоўнай і эстэтычнай скіраванасцю. *Л. Рублеўская* спалучыла ў сваіх эсэ філасофскае мысленне і інфарматыўнасць. Аб’ектыўныя рэальныя факты ўтвараюць карціну свету пісьменніцы. Яе эсэ ўнікальныя тым, што ў іх няма нават намёку на павучальнасць, але праз выразныя аўтарскія філасафемы раскрываецца цэлы комплекс духоўна-эстэтычных каштоўнасцей.

Адметнасці эсэ пісьменнікаў абумоўлены не толькі часам, адукацыяй і навуковай школай, праз якую яны прайшлі, але і “мужчынскім” і “жаночым” успрыманнем свету.

Духоўна-эстэтычныя каштоўнасці беларусаў у эсэ У. Караткевіча і Л. Рублеўскай, мы лічым, вызначаюцца праз універсальныя сімвалы культуры народа, такія, як камень, агонь, вада, снег, ралля (поле), храм.

***Камень*** *для Л. Рублеўскай і У. Караткевіча* – гэта сімвал народнай культуры, гісторыі народа, які дапамагае знайсці карані свайго роду, выхаваць у сабе гонар і павагу да сваёй краіны. *Для Л. Рублеўскай* горад – гэта каменны свет. Для яе “храм нашае гісторыі – гэта проста камень” [4, с. 12], “у кожным каменьчыку – ёсць Беларусь” [4, с. 15]. *Для У. Караткевіча* гарады, найперш, няпростая гісторыя Беларусі. Пісьменнік лічыць, што “па адным каменьчыку можна аднавіць гісторыю” [3, с. 62].

*Для У. Караткевіча* ***агонь*** найперш купальскі. Пісьменнік хоча, каб тысячы купальскіх агнёў палалі над краінай, каб людзі нарэшце ўзгадалі купальскія песні, каб адрадзілі сваю прыгажосць ва ўсім і назаўсёды, каб памяталі, што наша краіна сонечная, цёплая, светлая, як і самі беларусы [3]. *Л. Рублеўская* падказвае нам, што святло можна разгледзець у храме, у тэатры, у творах мастацтва, у каханні, памятаючы, што хапае ў нашай крыві і агню вогненных вёсак, чарнобыльскага рэактара, а таксама агню-знічу і Вечнага агню [4].

*У. Караткевіч* лічыць, што Дняпро, Палессе – гонар Беларусі. Для *Л. Рублеўскай* ***вада*** – энергія, дабраславенне і праклён. Пісьменніца спадзяецца на ваду жывую, як спадзяецца на яднанне свядомасці і неўсвядомленага, што дазволіць чалавеку стацца асобай

цэласнай. І *У. Караткевіч*, і Л. *Рублеўская* перасцерагаюць нас ад безадказнасці, бо яна не дазволіць нашчадкам быць шчаслівымі і гарманічнымі, не дазволіць расквітнець краіне на поўную моц. Выйсце з гэтага бачыць *У. Караткевіч*: трэба кожнаму з нас усвядоміць сябе кропляй "цэлага мора, вечнага мора, імя якому – народ", усвядоміць, што ад кожнага з нас залежыць будучыня ўсяго беларускага народа.

І ва *У. Караткевіча, і ў Л. Рублеўскай* ***снег*** – гэта прыгажосць, чысціня і ўтульнасць, як сапраўныя, так і здрадлівыя, ён і сябра, і здраднік, ён і роўнядзь, і бездань, гэта і смерць, і сувязь з іншасветам.

Для *У. Караткевіча* найбольшае багацце – родная зямля. ***Поле*** – сімвал волі, міру і святла. Гэта песня. Вечна магутныя людзі. Гэта нязменныя высновы: "есці хлеб з поля, якое ты сам урабіў", не знішчаць прыгажосці, бо гэта "абкраданне душы народа". *Л. Рублеўская* выразна вызначае, што для беларуса поле – гвалтоўная смерць лесу, і ў гэтым трагічнасць вобраза-сімвала, якая ўзмацняецца палямі, засеянымі касцьмі, крывавымі разорамі. Пісьменніца акрэслівае дваістасць сімвала поля. *І Л. Рублеўская, і У. Караткевіч* адзначаюць чалавечую бездапаможнасць і безабароннасць у полі. *Абое* пацвярджаюць эстэтычнае крэда М. Багдановіча "нашто каласы, калі няма васількоў", а самое поле *Л. Рублеўская* лічыць Багдановічавай антытэзай "каласка і васілька, матэрыяльнай карысці і чыстае красы". У эсэ Л. Рублеўскай поле – і спадзяванне на адраджэнне, на вяртанне да жыцця.

У. Караткевіч лічыць, што ***храм*** нараджае пачуццё велічы і гонару, гэта душа нашых геніяльных продкаў, веліч нашай гісторыі, гэта творы мастацтва, наталенне душы прыгажосцю; заклікае захаваць гэты скарб і перадаць яго нашчадкам. Л. Рублеўская адзначае, што духоўная сутнасць храма бессмяротная, і прапаноўвае ўбачыць у храме святло падчас цемры; стварыць у душы храм, чысты, светлы, прыгожы, непарушны, значыць, маральны, духоўны, эстэтычны; прапаноўвае рабіць крокі да храма, добрыя справы, адкрываць сябе, спасцігаць таямніцы душы, рухацца наперад, станавіцца лепшым, прытрымлівацца годных, справядлівых, чалавечных, гуманных законаў, быць у суладдзі, у гармоніі са сваім унутраным "я". У. Караткевіч раіць быць уважлівымі да бацькоў, сяброў, разам тварыць добрыя справы на нашай добрай зямлі. Абое яны просяць узводзіць храмы на месцы зруйнаваных, асабліва клапоціцца Л. Рублеўская як мінчанка пра храм на беразе Свіслачы.

Такім чынам, комплекс духоўна-эстэтычных каштоўнасцей, якіх спрадвеку прытрымліваўся беларус, дазваляе быць патрыётам сваёй

радзімы, быць памяркоўным, міралюбівым, талерантным да людзей з адрозным мысленнем, светаўспрыманнем, стрыманым, трывалым і вынослівым, працавітым, заўважаць свае недахопы, шчыра выказваць свае эмоцыі, мець вялікую павагу да памерлых і да тых, хто будзе пасля нас.

## ЛІТАРАТУРА


1. Бажок, І. Філасофскае асэнсаванне рэчаіснасці ў эсэістыцы Людмілы Рублеўскай / І. Бажок // Роднае слова – 2018 – № 1. – С. 28–31.
2. Жаўняровіч, П. П. Публіцыстычны дыскурс Уладзіміра Караткевіча / П. П. Жаўняровіч; навук. рэд. В. І. Іўчанкаў. – Мінск: РІВШ, 2011. – 244 с.
3. Караткевіч, У. Збор твораў. У 25 т. / Уладзімір Караткевіч – рэд. тома Віктар Іўчанкаў – Мінск : Мастацкая літаратура, 2016. – Т. 12 : Публіцыстыка. Эсэ-нарысы. – 781 с.
4. Рублеўская, Л. І. Шыпшына для Пані : вершы і эсэ / Людміла Рублеўская. – Мінск : Маст. літ., 2007. – 254 с.
5. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы : у 5 т. / АН БССР, Ін-т мовазн. імя Я. Коласа ; пад агульн. рэд. К. К. Атраховіча. – Мінск: БелСЭ, 1977 – 1984. – 5 т.


УДК 821.161.3-311.6

Навуч. В.М. Азелава
Навук. кір. Н. С. Чухольская, настаўніца беларускай мовы і літаратуры
(ДУА «Сярэдняя школа №12 г. Слуцка»)

# “З ПРЫРОДАЙ ЗЛІЎШЫСЯ ДУШОЙ…” (ПЕЙЗАЖ НАСТРОЮ Ў ПАЭЗІІ І ЖЫВАПІСЕ НА ПРЫКЛАДАХ ТВОРАЎ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА І ВІТОЛЬДА БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў АДЛЮСТРАВАННІ ПОРАЎ ГОДА)

На цяперашнім этапе развіцця грамадства становяцца актуальнымі праблемы сапраўднага мастацтва і духоўнасці. Універсальнымі сродкамі для павышэння свайго духоўнага ўзроўню былі і будуць жывапіс і літаратура. Вывучаючы, найперш, паэзію слова, бачым сродкі, якімі карыстаецца пісьменнік або паэт. Гэта метафары, эпітэты, увасабленне, параўнанні. Мастак жа перадае на палатне бачанне свету праз колеры, адценні, святло. Кожны з іх уздзейнічае на чалавека па-рознаму, але дасягае мэты аднолькавай –